# ГУКІ І ЛІТАРЫ

## Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме

**1.** Вымавіце словы парамі. Якімі гукамі яны адрозніваюцца?

нос — нёс
воз — вёз

стол — столь
вугал — вугаль



***столь*** — рус. *потоло́к*

Якімі літарамі адрозніваюцца словы? Як перадаецца на пісьме мяккасць зычных гукаў?

Зычныя гукі бываюць цвёрдыя і мяккія. Мяккасць зычных гукаў на пісьме абазначаецца літарамі ***е, ё, ю, я, і, ь***: *верасе**нь**, к**лё**н, **лі**па, з**яз**ю**л**я*.



Правообладатель Национальный институт образования

**2.** Прачытайце. Вымавіце выдзеленыя словы парамі. Якія гукі адрозніваюць значэнне аднаго слова ад другога?

Мой мядзведзік мае **моду**
перад сном паесці **мёду.**

А грыбоў жа ў **бары**!
Самі просяцца: **бяры**!

Зноў карась разводзіць **плёткі:**
— Шчупака пабілі **плоткі.**

*Н. Сторажава.*



***разво́дзіць плёткі*** *— гаворыць няпраўду*
***ма́е мо́ду*** *— мае звычку*

Выпішыце выдзеленыя словы. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккасць зычных гукаў на пісьме.

**3.** Разгледзьце форзацы. Назавіце парныя цвёрдыя і мяккія зычныя гукі. Які гук [й’]? Які гук [ў]? Вымавіце словы *гара, гіра*. У якім слове гук [г] цвёрды, а ў якім — мяккі?



Правообладатель Национальный институт образования

**4.** У радзе літар знайдзіце назвы рыб.

шчупакарплоткакунёкарась



*шч..к*



*пл..а*



*к..п*



*а..к*



*к..сь*

Запішыце гэтыя словы.

Назавіце словы з мяккімі зычнымі гукамі. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккія зычныя гукі, разам з наступнай літарай.

У з о р: *акунёк*.

**5.** Прачытайце. Што трэба для рыбалкі?

Вось кручок, вось чарвячок,
Лёска, палка — і рыбалка.
Закідай хутчэй, Міхалка.

*У. Карызна.*

Спішыце. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккасць зычных гукаў на пісьме.



Правообладатель Национальный институт образования

**6.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна вымаўляць яе.

Сам з сябе смяецца сом,
сом прысніў са смехам сон.
*К. Камейша.*

Выпішыце словы, у якіх усе зычныя цвёрдыя. Назавіце словы, якія адрозніваюцца паміж сабой адным гукам.



**7.** Адгадайце загадку.




Хто жыве ў віры ля кручы,
паласаты і калючы,
мае крылы, хоць не птах,
а на рыб наводзіць жах?
*С. Кацуба.*



***вір*** *— глыбокае месца ў рацэ, дзе адбываецца завіхрэ́нне вады*
***кру́ча*** *— круты бераг*

Спішыце загадку. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккія зычныя гукі, разам з наступнай літарай.



Правообладатель Национальный институт образования

**8.** Прачытайце. Устаўце ў сказ словы з дужак.

Чмель стаміўся, сеў на ... , адпачне і будзе ... *(лотаць, лётаць)*. *(Н. Сторажава.)*



*лотаць*

Якімі гукамі адрозніваюцца словы ў дужках? Якімі літарамі адрозніваюцца гэтыя словы?

*суcе́д*

**9.** Прачытайце верш.

**Люстэрка**

Ва ўсіх ры́бак-дзяўчат
карп люстра́ны — нарасхват.
Ці збіраецца **бяседа**,
ці гулянка ў **суседа** —
**модніцы** да карпа гужам:
ён люстэркам добрым служыць.

*В. Зуёнак.*



***люстэ́рка*** — рус. *зе́ркальце*
***гу́жам*** — *адзін за адным*

Выпішыце выдзеленыя словы. Назавіце ў іх мяккія зычныя гукі. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккасць зычных гукаў на пісьме.



Правообладатель Национальный институт образования

**Рм** **10.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

Майго (маю) ... па парце клічуць ... .
У ... з намі кватэры жыве сям'я ... .
На дрэве ў двары сядзіць ... кот.
Краіны **Літва**, Латвія, Расія, **Польшча**, Украіна — ... Беларусі.

Словы для даведкі: *суседку, суседа, суседкі, суседняй, суседскі*.

Запішыце апошні сказ. У выдзеленых словах назавіце мяккія зычныя гукі. У якім з гэтых слоў літар больш, чым гукаў? Чаму?

**11.** Прачытайце прымаўку. Калі так гавораць?

Рыбка ў рацэ́, ды не ў руцэ́.

Назавіце словы, якія адрозніваюцца адным гукам. Назавіце зычныя гукі ў гэтых словах. Яны мяккія ці цвёрдыя?

**12.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна вымаўляць яе.



Правообладатель Национальный институт образования

Пайшоў Сёма лавіць сома,
Соня спіць спакойна дома.
Сёму — сом, Соні — сон.
*М. Мінчанка.*

Назавіце пары слоў, якія адрозніваюцца адным гукам. Запішыце гэтыя словы пад дыктоўку настаўніка.

Назавіце пару слоў, якая адрозніваецца гукамі [с] — [с’].



**13.** Прачытайце верш.



З татам крочым на рыбалку,
я люблю рыбалку змалку.
Вуды, бле́шня і чарвяк...
Ты плыві да нас, шчупак!
*Т. Мушынская.*



***бле́шня** — металічная пласцінка, да якой прымацоўваецца кручок*

Спішыце першы сказ. Падкрэсліце словы, у якіх усе зычныя гукі цвёрдыя.



Правообладатель Национальный институт образования